Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________ Ю. П. Бондар
«____» _____________2014 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/баз.

# ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ
## Раздзел 4. ГІСТОРЫЯ ДЖАЗАВАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка),*
*1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка),*
*1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**
*І. А. Смірнова,* прафесар кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. Л. Капілаў,* рэктар установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.Шырокава», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*Д. Ю. Пярсідская,* загадчык кафедры рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 14.02.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 19.12.2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. А. Смірнова

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя мастацтва эстрады» складаецца з чатырох раздзелаў: «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва», «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага тэатра», «Гісторыя джазавага выканальніцтва». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння чацвёртага раздзела «Гісторыя джазавага выканальніцтва».

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя джазавага выканальніцтва» з’яўляецца часткай тэарэтычнай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі азначанай спецыяльнасці і мае цесную ўзаемасувязь з такімі дысцыплінамі, як «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага тэатра», «Гісторыя рок-музыкі», «Сучасныя стылі джазавай музыкі», «Джазавыя стандарты». Значнасць дадзенай дысцыпліны абумоўлена тым, што яе вывучэнне будзе садзейнічаць пашырэнню базавай музычнай адукацыі студэнтаў, неабходнай для грунтоўнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў названых напрамкаў у галіне джазавага выканальніцтва.

Вывучэнне «Гісторыі джазавага выканальніцтва» грунтуецца на тэарэтыка-практычным метадзе засваення джазавага выканальніцтва як віду мастацкай творчасці, які прадугледжвае азнаямленне з выканальніцкай практыкай лепшых майстроў сусветнага і беларускага джаза на навучальным аўдыя- і відэаматэрыяле. Матэрыял, які прапануецца для вывучэння, падпарадкаваны акадэмічнай канцэпцыі і храналогіі развіцця джазавага выканальніцтва ў рамках яго гістарычнай прэзентацыі ў ЗША, Заходняй Еўропе, Расіі і Беларусі.

*Асноўная мэта* дысцыпліны – даць цэласнае прадстаўленне аб сутнасці джазавага выканальніцтва – спецыфічнага аўтарскага спосабу стварэння мастацкай выявы сродкамі выразнасці джазавай музыкі і выканальніцтва.

*Задача дысцыпліны* – навучыць навыкам правядзення аналізу выканальніцкага майстэрства як аўтарскага спосабу стварэння мастацкай выявы, набыць уменні вызначаць і аналізаваць выканальніцкія прыёмы і сродкі выразнасці лепшых майстроў сусветнага і беларускага джаза.

У выніку засваення дысцыпліны выпускнікі павінны *ведаць:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– музычную мову і прынцыпы пабудовы твораў джазавай музыкі;
– індывідуальныя выканальніцкія стылі і творчыя дасягненні лепшых майстроў у галіне джазавай музыкі;
– спецыфіку джазавай імправізацыі як найважнейшага спосабу стварэння мастацкага цэлага і самавыяўлення прадстаўнікоў джазавага выканальніцтва;
– творчую дзейнасць сусветных і беларускіх дзеячаў у сферы джазавага выканальніцтва;

*умець:*

– валодаць катэгарыяльным апаратам джазавай музыкі і выканальніцтва;
– асэнсоўваць і аналізаваць сістэму выразных сродкаў джаза як выканальніцкага мастацтва;
– аналізаваць індывідуальныя выканальніцкія стылі лепшых майстроў джазавай музыкі;
– вызначаць спецыфічныя рысы джазавай імправізацыі як найважнейшага спосабу самавыяўлення прадстаўнікоў джазавага выканальніцтва;
– на практыцы ўстанаўліваць сувязь паміж мастацкімі заканамернасцямі выконваемай джазавай музыкі, яе тэарэтычным аналізам і праблемамі выканальніцтва.

Выкладанне дысцыпліны здзяйсняецца з выкарыстаннем метадаў педагогікі і мастацтвазнаўства:
– пасіўны метад (форма пасіўнага ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам у працэсе засваення лекцыйнага матэрыялу);
– актыўны метад (форма актыўнага ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам – рэжым дыялогу ў працэсе засваення лекцыйнага матэрыялу);
– інтэрактыўны метад (арыентацыя на шырокае ўзаемадзеянне студэнтаў не толькі з выкладчыкам, але і паміж сабой, на дамінаванне актыўнасці навучэнцаў у працэсе практычных занятkаў і выкананні творчых заданняў);
– метад комплекснага мастацтвазнаўчага аналізу выканання джазавых твораў (узровень выканання, стылістычныя прыёмы, выканальніцкая тэхніка, каноны жанру, стылю і г. д.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя джазавага выканальніцтва» ўсяго адводзіцца 70 гадзін, з іх 26 гадзін – аўдыторныя заняткі (10 гадзін – лекцыі, 16 гадзін – практычныя заняткі). Рэкамендуемая форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя |
| *Тэма 1*. Уводзіны | 1 | 1 | |
| *Тэма 2*. Джазавае выканальніцтва як від мастацкай творчасці | 5 | 3 | 2 |
| *Тэма 3*. Выканальніцкае мастацтва майстроў амерыканскага і заходнееўрапейскага джаза | 8 | 2 | 6 |
| *Тэма 4*. Выканальніцкае мастацтва майстроў расійскага джаза | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 5*. Выканальніцкае мастацтва майстроў беларускага джаза | 6 | 2 | 4 |
| **Разам…** | **26** | **10** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. Уводзіны*

Прызначэнне, асноўная мэта і задачы дысцыпліны «Гісторыя джазавага выканальніцтва». Яе месца і роля ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «мастацтва эстрады». Узаемасувязь з такімі прафілюючымі дысцыплінамі, як «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза», «Сучасныя стылі джазавай музыкі», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага мастацтва», «Гісторыя рок-музыкі», а таксама «Спецінструмент», «Імправізацыя», «Эстрадны клас», «Камп'ютарная аранжыроўка».

### *Тэма 2. Джазавае выканальніцтва як від мастацкай творчасці*

Музыкальнае выканальніцтва – творчы працэс узнаўлення музычнага твора сродкамі выканальніцкага майстэрства.

Джазавае выканальніцтва – творчы працэс стварэння/узнаўлення музычнага твора сродкамі джазавага выканальніцкага майстэрства і джазавай імправізацыі.

Віды джазавага выканальніцтва: аркестравае, ансамблевае, сольнае.

Вытокі джазавай школы выканальніцтва – музычная народная творчасць, аматарская дзейнасць прадстаўнікоў архаічнага джаза, відавочныя ўрокі, перадача прыёмаў «ужывую» ад настаўніка да вучня: Джо «Кінг» Олівер – Луі Армстранг; Джэймс Джонсан – Фэтс Уолер; Уілі Лайан Сміт – «Дзюк» Элінгтан і інш. Прынцып пераемнасці ў развіцці джазавага выканальніцтва.

Моўныя асаблівасці джазавага выканальніцтва: экстэнсіўнае выкананне, спецыфічная акцэнтуацыя, міжтактавая фразіроўка, строгае захаванне тэмпу, багацце дысанансаў, кластараў, шырокае выкарыстанне полірытміі, ускладненых форм сінкапіравання, прыёму «ragging a tune», лабільнасць музычнай інтанацыі (гукавышынная няўстойлівасць), апора на «блюзавы гукарад», багатая разнастайнасць прыёмаў гуказдабывання (глісанда, спецыфічная вібрацыя, «субтоны») і г. д. Свінг як выканальніцкая манера.

Джазавая імправізацыя як метад стварэння музычнага цэлага і спосаб самавыяўлення музыкі-выканаўцы. Віды джазавай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імправізацыі: сольная, калектыўная; вакальная, інструментальная, вакальна-інструментальная; меладычная, гарманічная, рытмічная, ладавая, фактурная, комплексная; падрыхтаваная, непадрыхтаваная.

### *Тэма 3. Выканальніцкае мастацтва майстроў амерыканскага і заходнееўрапейскага джаза*

Classic jazz – рэспансорны прынцып ансамблевай ігры, апора на блюзавую традыцыю, на кола спецыфічных выразных сродкаў і тэхнічных прыёмаў – «off beat», драйв, «dirty tone», шаут-эфекты, стомпінг, брэйкі, стоп-тайм-тэхніка, хот-манера і інш.

Выканальніцкая творчасць джаз-ансамбля «Original Dixieland Jazz-Band» (кір. Нік Ла Рока); аркестраў Джо Кінга Олівера, Сіднея Бешэ.

Лепшыя выканаўцы блюза – Гертруда «Ма» Рэйні, Бесі Сміт, Іда Кокс, Альберта Хантар, Сара Марцін, Білі Холідэй, Эла Фіцджэральд і інш.

Свінг – аркестры «Дзюка» Элінгтана, Каўнта Бэйсі, Бэні Гудмэна, Вудзі Германа, Глена Мілера і інш.

Сімфаджаз – калектыў Пола Уайтмэна. Канцэртны джаз.

Выканальніцкая творчасць Луі Армстранга, Бікса Бейдэрбэка, Махаліі Джэксан, Джоні Додса, Банка Джонсана, Джэлі Рол Мортана, Бада Паўэла, Луіса Расела, Арта Тэйтума, Фрэнка Тэшамахера, Джэка Тыгардэна, Чыка Уэба, Флетчэра Хендэрсана і інш.

Modern jazz – рознабаковыя эксперыменты і пошукі новых сродкаў выразнасці: ускладненне мелодыкі, гарманічнай мовы, рытмікі, пашырэнне інтанацыйнай і ладавай сфер; выкарыстанне сістэмы гукаў з 9-ці храматычных варыянтаў лідзійскага лада і «модусаў»; незалежная імправізацыя, заснаваная на адвольным радзе гукаў, якія звязаны паміж сабой выключна ладам; сінтэз элементаў джаза і еўрапейскай сімфанічнай рок- і поп-музыкі, рэпа і інш.

Выканальніцкая творчасць джазавых музыкантаў, якія сталі стваральнікамі новых стылявых кірункаў Modern jazz:

*Bebop* – Чарлі Паркер і Дызі Гілеспі. *Hardbop* – Джон Колтрэйн. *Прагрэсіў* – Стэн Кентан. *Cool jazz* – Лестар Янг, Майлз Дэвіс, Стэн Гетц. *Free jazz* – Орнет Коулмен, Сэсіл Тэйлар. *Босанова* – Антоніа Карлас Жабін, Жуан Жылберту, Стэн Кентан. *Modal jazz* (ладавы джаз) – Майлз Дэвіс, Джон Колтрэйн.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Fusion* – Майлз Дэвіс, Джо Завінула, групы MAHAVISHNU, WEATHER REPORT і SINDICATE.

Творчасць Арта Блэйка, Дэйва Брубека, Дакстэра Гордана, Чарлза Мінгуса, Фэтса Наваро, Мішэля Петручыяні, Оскара Пітэрсэна, Джона Расела, Тэадора «Соні» Ролінса, Джанга Рэйнхардта, Жана Люка Панці, Стэфана Грапелі і інш.

Найбольш знакамітыя міжнародныя джазавыя фестывалі музыкантаў-выканаўцаў: Мантрё (Швейцарыя), Фэст Паўночнага мора (North Sea Jazz), Ньюпарт, Чыкага (ЗША).

### *Тэма 4. Выканальніцкае мастацтва майстроў расійскага джаза*

Выканальніцкая дзейнасць аркестравых і ансамблевых калектываў.

«Першы ў РСФСР эксцэнтрычны аркестр – джаз-бэнд» пад кіраўніцтвам Валянціна Парнаха, ансамбль «ПЭКСА» пад кіраўніцтвам Леаніда Варпахоўскага, «Амаджаз» пад кіраўніцтвам Аляксандра Цфасмана, «Першы канцэртны джаз-бэнд» пад кіраўніцтвам Леапольда Цяпліцкага, «Перасовачны канцэртны джаз-бэнд» пад кіраўніцтвам Барыса Крупышава, «Ленінградская джаз-капэла» пад кіраўніцтвам Георгія Ландсберга, джаз-аркестр пад кіраўніцтвам Якава Скамароўскага, «Тэа-джаз» Леаніда Уцёсава. Джаз-аркестры А. Лундстрэма, Г. Гараняна, Ю. Саульскага, Ю. Сіланцьева, І. Вайнштэйна, М. Мінха, В. Людвікоўскага; джаз-рок ансамбль «Арсенал» А. Казлова, джаз-тэатр А. Кірэева; джаз-ансамбль А. Багусевіча і інш.

Творчая дзейнасць І. Брыля, Д. Галашчокіна, А. Растоцкага, Л. Чыжыка, І. Бутмана, А. Шылклопера, А. Асейчука і інш.

### *Тэма 5. Выканальніцкае мастацтва майстроў беларускага джаза*

Выканальніцкая дзейнасць аркестравых і ансамблевых калектываў.

Дзяржаўны джаз-аркестр БССР пад кіраўніцтвам Эдзі Рознера. «Беларускі дыксіленд» пад кіраўніцтвам Авеніра Вайнштэйна, Нацыянальны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, маладзёжны аркестр «Symphonic drive orchestra» пад кіраўніцтвам Аляксандра Ліпніцкага, джаз-ансамбль «Рэнесанс» пад кіраўніцтвам Мікалая Лап-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цёнка, джаз-ансамбль «Яблычная гарбата» пад кіраўніцтвам Аляксандра Сапегі, джаз-ансамбль «Дыліжанс-jazz» пад кіраўніцтвам А. Лабчэўскага, вакальны ансамбль «Камерата» пад кіраўніцтвам Ігара Мельнікава, група «Drum Ecstasy» – лідар Філіп Чмыр і інш.

Творчая дзейнасць С. Анцішына, А. Архіпава, А. Бурштэйна, У. Бялова, К. Гарачага, І. Капланава, А. Каліноўскага, В. Людвікоўскага, М. Няронскага, І. Паліводы, А. Пыталева, І. Сафонава, І. Сацэвіча, У. Семянюка, А. Старажука, У. Ткачэнкі, У. Угольніка, М. Федарэнкі, У. Фельгіна, В. Шчарыцы, А. Шпянёва, В. Чайкова, А. Эскіна, В. Ямуцеева і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Барбан, Е.* Джазовые диалоги / Е. Барбан. – СПб. : Композитор, 2006. – 304 с.

*Барбан, Е.* Джазовые опыты / Е. Барбан. – СПб. : Композитор, 2007. – 336 с.

*Барбан, Е.* Черная музыка – белая свобода. Музыка и восприятие нового джаза / Е. Барбан. – СПб. : Композитор, 2007. – 284 с.

*Верменич, Ю.* Джаз. История. Стили. Мастера / Ю. Верменич. – СПб. : Лань & Планета музыки, 2005. – 608 с.

*Кинус, Ю. Г.* Из истории джазового исполнительства / Ю. Г. Кинус. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2009. – 158 с.

*Коллиер, Д.* Луи Армстронг. Американский гений / Д. Коллиер. – М. : Прессверк, 2001. – 510 с.

*Левиновский, Н.* Эдди Рознер – золотая труба / Н. Левиновский // Новое русское слово. – 1996. – № 15.

*Переверзев, Л.Б.* Дюк Эллингтон и его оркестр / Л. Б. Переверзев // Музыкальная жизнь. – 1971. – № 22. – С. 14–16.

*Питерсон, О.* Джазовая одиссея. Автобиография / О. Питерсон. – СПб. : Скифия, 2011. – 544 с.

*Саймон, Д.* Большие оркестры эпохи свинга / Д.Саймон. – СПб. : Скифия, 2008. – 616 с.

*Саймон, Д.* Гленн Миллер и его оркестр / Д. Саймон. – СПб. : Скифия, 2010. – 260 с.

Советский джаз. Проблемы. События. Мастера: сб. ст. / сост. и ред. А. Медведев, О. Медведева. – М. : Сов. композитор, 1987. – 591 с.*

*Тепляков, С.* Дюк Эллингтон. Путеводитель для слушателя / С. Тепляков. – М. : Аграф, 2004. – 512 с.

*Утесов, Л. О.* Спасибо, сердце! / Л. О. Утесов. – М. : Вигрус, 2000. – 363 с.

*Фейертаг, В.* История джазового исполнительства в России / В. Фейертаг. – СПб. : Скифия, 2010. – 308 с.

*Фейертаг, В.* Джаз. XX век: энцикл. справочник / В. Фейертаг. – СПб. : Скифия, 2001. – 562 с.

---

* Літаратура, якая ёсць у наяўнасці ў бібліятэцы БДУ культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фейертаг, В.* Джаз в России: краткий энцикл. справочник / В.Фейертаг. – СПб. : Скифия, 2009. – 528 с.

*Шапиро, Н.* Творцы джаза / Н. Шапиро, Н. Хентофф. – Новосибирск : Сибир. унив. изд-во, 2005. – 392 с.

*Дадатковая*

*Азарян, Д.* Джаз и фольклор / Д. Азарян // Сов. музыка. – 1985. – № 12. – С. 118.

*Барбан, Е.* Идея импровизации: развитие стиля в джазе / Е. Барбан // Родник. – 1990. – № 12. – С.19–21.

*Бержеро, Ф.* История джаза со времен бопа / Ф. Бержеро, А. Мерлин. – М. : АСТ-Астрель, 2003. – 160 с.

*Гладков, Г.* Пути «третьего направления» / Г. Гладков // Музыкальная жизнь. – 1988. – №14. – С. 2.

*Гладышев, В. Ф.* Терпилиада: Жизнь и творчество Генриха Терпиловского / В. Ф. Гладышев. – СПб. ; Пермь : Маматов, 2008. – 208 с.

*Кинус, Ю. Г.* Джаз: истоки и развитие / Ю. Г. Кинус. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2011. – 496 с.

*Козлов, А.* Джаз, рок и медные трубы / А. Козлов // Огонек. – 1990. – № 29. – С. 20–23.

*Коллиер, Д.* Становление джаза / Д. Коллиер. – М. : Радуга, 1984. – 390 с.*

*Коллиер, Д.* Дюк Эллингтон / Д. Коллиер. – М. : Радуга, 1991. – 349 с.

*Конен, В. Д.* Блюзы и XX век / В. Д. Конен. – М. : Музыка, 1980. – 81 с.*

*Конен, В. Д.* Пути американской музыки. Очерки по истории музыкальной культуры США / В. Д. Конен. – 3-е изд. – М. : Сов. композитор, 1977. – 446 с.*

*Конен, В. Д.* Третий пласт: Новые массовые жанры в музыке XX века / В. Д. Конен. – М. : Музыка, 1994. – 160 с.*

*Конен, В. Д.* Современная музыка буржуазного Запада / В. Д. Конен. – М. : Знание, 1961. – 32 с.

*Конен, В. Д.* Этюды о зарубежной музыке: сб.ст. / В. Д. Конен. – 2– е изд. – М. : Музыка, 1975. – 479 с.

*Конен, В. Д.* Рождение джаза / В. Д. Конен. – 2-е изд. – М. : Сов. композитор, 1990. – 319 с.*

*Минх, Н.* Джаз / Н. Минх // Музыкальная энциклопедия: в 6 т. – М. : Сов. энциклопедия, 1974. – Т.2. – С. 211–219.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Минх, Н.* Размышления о джазе / Н. Минх // Сов. музыка. – 1958. – № 2. – С. 42–43.

Музыкальный словарь Д. Гроува / Д. Гроув; пер. с англ., ред. и доп. Л. О. Акопяна. – М. : Практика, 2001. – 1095 с.

*Овчинников, Е. В.* История джаза: учеб. пособие / Е. В. Овчинников. – М. : Музыка, 1994. – Вып. 1. – 240 с.

*Озеров, В. Ю.* Джаз. США: учеб.-справ. пособие / В. Ю.Озеров. – М. : ГМПИ, 1990. – 159 с.

*Панасье, Ю.* История подлинного джаза / Ю. Панасье; пер. с фр. Л. Н. Никольской. – Л. : Музыка, 1979. – 128 с.*

*Переверзев, Л.* Джаз-банд / Л. Переверзев // Музыкальная энциклопедия: в 6 т. – М. : Сов. энциклопедия, 1974. – Т. 2. – С. 219–220.*

*Печерский, П.* Психологические и социальные корни джаза / П. Печерский // Наука и техника. – Рига, 1968. – № 6. – С. 26–29.

*Сапонов, М. А.* Искусство импровизации: импровизационные виды творчества в западноевропейской музыке средних веков и Возрождения / М. А. Сапонов. – М. : Музыка, 1982. – 77 с.

*Сарджент, У.* Джаз. Генезис. Музыкальный язык. Эстетика / У. Сарджент; пер. с англ. М. Н. Рудковской, В. А. Ерохина. – М. : Музыка, 1987. – 294 с.*

*Саульский, Ю. С.* Немного об эстрадных, джазовых составах и рок-музыке / Ю. Саульский // Книга о музыке. – 2-е изд. – М. : Сов. композитор, 1989. – 21 с.

*Симоненко, В.* Лексикон джаза / В. Симоненко. – Киев : Музична Україна, 1984. – 111 с.*

*Симоненко, В.* Мелодии джаза / В. Симоненко. – 2-е изд. – Киев : Музична Україна, 1984. – 98 с.

*Уильямс, М.* Краткая история джаза / М. Уильямс // США. Экономика. Политика. Идеология. – 1974. – № 1. – С. 107–115; № 10. – С. 84–89.

*Шестаков, В. П.* Искусство тривиализации: некоторые теоретические проблемы «массовой культуры» / В. П. Шестаков // Вопросы философии. – 1982. – № 10. – С.105–116.

*Шестаков, Г. Ю.* Музыка в буржуазной «массовой культуре»: критические очерки / Г. Ю. Шестаков. – М. : Музыка, 1986. – 126 с.

Энциклопедический музыкальный словарь / сост. Б. Штейнпресс, И. Ямпольский. – М. : Сов. энциклопедия, 1966. – 632 с.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Feather, L.* The encyclopedia of jazz in the sixties / L. Feather. – N.Y., 1966.

*Asriel, A.* Jazz. Analysen und Aspecte / A. Asriel. – Berlin : VEB Lied der Zeit Musikverlag, 1977.

*Hodeir, A.* Jazz: evolution and essence / A. Hodeir. – N.Y. : Grove press, 1958.

*Sargent, W.* Jazz: Hotend and Hybrid / W. Sargent. – N. Y. : Da capo press, 1975.

*Ulanov, B.* Histori of jazz in America / B. Ulanov. – N. Y. : The Viking Press; London, 1959.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дыскаграфія

DVD-video Кен Бернс «Джаз: вся история с 1917 г. по 2001 г.»
Производство США, Великобритания.
Прокатное удостоверение по СНГ W: 128011002 от 10.01.2006 г.

DVD-video «Глен Миллер»
Производство США.
Прокатное удостоверение по СНГ W: 128011001 от 10.01.2006 г.

DVD-video «Antonio Carlos Jo Bim»
Jazzvizion, 1989. PolyGram Records

DVD-video «Count Basie at Carnegie Hall»
Kultur 195 Hingway 36. West Long Branch, NJ 07764. www. Kultur.com

DVD-video «Benny Goodman farewell»
Collector`s Edinion 2003 tv Masters B.V.

DVD-video «Ella Fitzgerald. Something to live for»
Educational Broadcasting Corporation All Right Reserved
1999 Winstar TV & Video 419 Park Avenue South
New York. NT 10016

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і ўжываецца комплексна.

1. Творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць студэнтаў.
2. Пісьмовы аналіз выканання джазавых твораў вядучымі прадстаўнікамі джаза.

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ**
**Раздзел 4. ГІСТОРЫЯ ДЖАЗАВАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка),*
*1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка),*
*1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,49. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ